Сінанімічны рад, асабліва мастацкай мовы, заўсёды характарызуецца незамкнёнасцю, магчымым узбагачэннем, папаўненнем за кошт унутрымоўных фактаў (дыялектных і прафесійных слоў; новых лексічных адзінак, створаных на базе наяўнага моўнага матэрыялу; адноўленых устарэлых адзінак), запазычванняў і г. д. Звернемся да тэксту: *А колькі нечаканых і* ***ласкава-захопленых*** *назваў прыдумалі* ***сакавіку*** *нашы прашчуры: ён і* ***зімабор****, ён і* ***светазар****, ён і* ***кропельнік****,* ***веснавей****,* ***пазімнік****,* ***сонцалюб****,* ***сонцабой****...* (Я. Сіпакоў). Такі рад слоў, бясспрэчна, выяўляе моўнае багацце, адлюстроўвае адметнасць светаўспрымання беларусаў і разнастайнасць мовы пісьменніка.

Такім чынам, за кошт аўтарскіх моўна-вобразных знаходак заўсёды выяўляюцца перспектывы развіцця мовы, у тым ліку шляхі ўзбагачэння яе выразнасці: магчыма, некаторыя прыведзеныя факты маўлення выйдуць за межы мовы твораў аднаго аўтара, зменяць свой індывідуальна-стылістычны змест на агульнамоўны і стануць здабыткам не толькі мовы мастацкай літаратуры, але і літаратурнай мовы.

## ДЗЕЙНАСЦЬ ЗАМЕЖНЫХ УСТАНОЎ КУЛЬТУРЫ ПА ЗАХАВАННІ І РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

**Сташэўская С. К.**
*кандыдат культуралогіі, рэдактар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (г. Мінск)*

***Аннотация.*** *В статье рассматривается деятельность ведущих зарубежных учреждений культуры по сохранению и репрезентации нематериального культурного наследия. Раскрывается роль экомузеев, домов фольклора, этнографических центров стран Европы, США, Канады и др. в развитии идей «новой музеологии», а также поддержании аутентичных форм народного творчества.*

***Summary.*** *The article examines the activities of leading foreign cultural institutions for the preservation and representation of intangible cultural heritage. The role of ecomuseum, houses the folklore and ethnographic centers of Europe, USA, Canada, etc. in the development of the ideas of the «new museology», as well as maintaining authentic forms of folk art.*

Тэндэнцыя да зберажэння і рэпрэзентацыі аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны па сродках устаноў культуры была абазначана ў грамадстве ў канцы XIX ст. Шведскі даследчык Артур Хаселіўс у 1870-я гады ў розных раёнах Швецыі арганізаваў выставы інтэр'ераў народнага жытла і строяў. Лепшая з іх, «Скандынаўская этнаграфічная калекцыя», якая была адкрыта ў 1873 годзе ў адным з прыватных дамоў Стакгольма, стала асновай Паўночнага музея. Імкнучыся захаваць згасаючыя рамёствы, народную творчасць і шматвекавыя традыцыі, А. Хаселіўс змясціў у экспазіцыі вялікія дыярамы інтэр'ераў жылых пабудоў, аднавіў іх аўтэнтычную абстаноўку, стварыў шэраг вулічных сцэн, скарыстаўшы пры гэтым чучалы жывёл, манекены ў народных строях і пейзажы ў выглядзе тэатральных дэкарацый [1]. Аднак такое мастацкае рашэнне не ўвасабляла адпаведную атмасферу, таму Артур Хаселіўс знайшоў нетрадыцыйнае рашэнне [2]. Для выканання сваіх планаў даследчык выбраў узгорак на востраве Дзьюгардэн у Стакгольме. У XVII ст. тут будавалі фартыфікацыйныя ўмацаванні, і ўся мясцовасць была занята акопамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таму і называлася «скансен» (у перакладзе са шведскага – «акоп») [3]. Гэтая назва перайшла і на створаны музей, які быў адкрыты ў кастрычніку 1891 года, а потым стала агульнай назвай для ўсіх музеяў пад адкрытым небам [4]. Тут упершыню адбылася спроба рэпрэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны праз паказ традыцыйнай вытворчасці.

Імкненне захаваць культурную самабытнасць узмацніла цікавасць грамадства на працягу другой паловы XIX ст. да з'яўлення і развіцця скансэнаў па ўсім свеце. Створаная А. Хаселіўсам канцэпцыя новага музея атрымала прызнанне ў Нарвегіі, Фінляндыі, Даніі, Паўночнай Германіі і Нідэрландах. Да 1914 года ў краінах пераважна Паўночнай Еўропы былі створаны 104 музеі пад адкрытым небам. Ідэя пераносу аб'ектаў народнай архітэктуры і побыту з мэтай іх захавання стала перадпасылкай узнікнення агульнасусветнай канцэпцыі захавання культурнай спадчыны па сродках іх музеефікацыі. Такім чынам, побач са скансэнамі пачалі ўзнікаць музеі «in situ» (размешчаныя ў захаваных на месцах пабудовах). У гэты ж перыяд з'яўляюцца ўстановы, створаныя па змешаных прынцыпах музейнага праектавання – побач з захаванымі на месцах пабудовамі экспанаваліся і перанесеныя пабудовы. Такі падыход у тэорыі і практыцы музейнай работы фарміраваўся паступова і аказаў значны ўплыў на развіццё экспазіцыйных ідэй XX ст.

З'яўленне музейнай установы новага тыпу ў пачатку XX ст. стала вынікам сацыяльнага запыту на ролю музея як культурна-гістарычнага цэнтра рэпрэзентацыі традыцыйнай культуры [5]. Такім чынам, у 1967 годзе ў Францыі былі створаны рэгіянальныя прыродныя паркі (Мон д'Аррэ, Уэсан, Гранд-Ланд, Камарг, Ніжняя Сена). Яны сталі аднымі з першаабразаў экамузеяў, якія пасля паспяхова былі ўвасоблены ў большасці краін свету. Адметнасць створаных музеёлагам Жоржам Анры Рыўерам музейных устаноў новага тыпу ад увасобленых крыху пасля экамузеяў у тым, што французскія экамузеі былі зроблены праз аднаўленне пабудоў, якія спрадвечна размяшчаліся на гэтых тэрыторыях. Сам тэрмін «экамузей» быў прапанаваны ў 1971 годзе музеёлагам Югам дэ Варынам. Этымалогія назвы дадзенага феномена звязана з паняццем «экалогія», аднак па сваёй сутнасці ахоплівае не толькі азначэнне музея навакольнага асяроддзя ці прыроды. Дадзены тэрмін выкарыстоўваюць у навуковым свеце для аналізу і атрыбуцыі такіх культурных з'яў, як рэгіянальная этнаграфія, культурная трансляцыя, актуалізацыя традыцыйнай культуры, ахова і папулярызацыя аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. У 1980 годзе пабачыла свет праца Ж. Рыўера «Эвалюцыйнае вызначэнне экамузея», у якой даследчык музеяграфіі адлюстраваў сутнасць распрацаванай ім канцэпцыі экамузея. «Экамузей – гэта запаведнік, бо ён садзейнічае захаванню і ацэнцы мясцовай прыроднай і культурнай спадчыны», – лічыць Ж. Рыўер. У той жа час, па меркаванні даследчыка, экамузей – гэта і школа, бо ён далучае мясцовых жыхароў да сваёй дзейнасці па вывучэнні і ахове спадчыны і садзейнічае больш паўнацэннаму ўсведамленню імі сваёй будучыні [6].

Па прынцыпе французскіх экамузеяў у 1980-я гады з'яўляюцца экамузеі ў канадскай правінцыі Квебек, у Бразіліі, Партугаліі, Афрыцы. Сярод найбольш вядомых замежных экамузеяў – Музей Сан-Крыстава ў Рыа-дэ-Жанэйра, Сейшальскі музей у Партугаліі, музей От-Бос у Канадзе. У 1980 г. у канадскай правінцыі Квебек адбылося адкрыццё Музея і рэгіянальнага цэнтра інтэрпрэтацыі От-Бос, які праз тры гады атрымаў назву Экамузей От-Бос. Ён быў створаны канадскім музеёлагам Пьерам Мейранам пры актыўным удзеле мясцовых жыхароў. Іх нематэрыяльная культурная спадчына складала важную частку рэпрэзентаваных у музеі аб'ектаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пачатку 1980-х гадоў з’явіліся першыя экамузеі ў Партугаліі. Сусветнавядомым з’яўляецца Муніцыпальны музей Сейшала, які ў 1984 годзе быў прызнаны лепшым заходнееўрапейскім музеем года. Асобныя прынцыпы экамузеяў сталі выкарыстоўваць у сваёй дзейнасці таксама некаторыя паркі-музеі і рэгіянальныя гістарычныя музеі ў Швецыі.

У больш позні перыяд канцэпцыя дзейнасці музеяў свету ў дачыненні да аб’ектаў этнаграфіі паступова змянілася. Гэта звязана з тым, што глабалізацыйныя працэсы сталі выклікаць рызыку страты разнастайнасці відаў культуры чалавецтва, у выніку чаго паняцце этнаграфічная, духоўная спадчына набыло асаблівы сэнс і новае азначэнне (нематэрыяльная культурная спадчына) для ўсёй культурнай грамадскасці свету. Перад навуковай супольнасцю паўстала неабходнасць аховы і захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Вядучыя ўстановы культуры свету змянілі сваю дзейнасць зыходзячы з задач, якія паставіла ЮНЭСКА краінам-удзельніцам, што ратыфікавалі Канвенцыю «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны».

Да прыкладу, у Мастацка-гістарычным музеі Вены (Аўстрыя) этнаграфічныя калекцыі з’яўляюцца самымі буйнымі ў свеце і складаюць звыш 200 000 адзінак захоўвання асноўнага этнаграфічнага фонду. Аснову музейнага збору складаюць фонды Аддзела антрапалогіі і этнаграфіі венскага Прыдворнага музея прыродазнаўчай гісторыі і змяшчаюць аддзелы: Паўночная і Цэнтральная Амерыка, Паўднёвая Амерыка, Дальні Ўсход, Цэнтральная Азія і Сібір, Аўстралія і Акеанія.

Значную этнаграфічную калекцыю і зборы па этнаграфіі і народным мастацтве Аўстрыі і іншых краін Еўропы ўтрымлівае Аўстрыйскі фальклорны музей. Асобная экспазіцыя прысвечана народнай культуры Аўстра-Венгерскай імперыі. Багацце калекцыі складаюць: кераміка, вырабы са шкла, тэкстыль, прылады працы. У калекцыі керамікі прадстаўлены ўсе тыпы кантэйнераў (і тэхналогіі іх вытворчасці) з Германіі, Італіі, Босніі, Верхняй і Ніжняй Аўстрыі, Зальцбурга, Заходняй Венгрыі, Галіцыі, Славакіі, Румыніі з перыяду XVII–XX стст. і агульнай колькасцю звыш 15 000 аб’ектаў.

Музей таксама рэпрэзентуе калекцыю шкла − пераважна сялянскага побыту. Упрыгожаны такія вырабы матывамі на тэму кахання, сям’і, шлюбу. Радзей сустракаецца шкло ў выглядзе жывел і збаны са схаваным пітным механізмам. Унікальнай у калекцыі з’яўляецца матавае шкло. Межы распаўсюджання дадзеных вырабаў − Венецыя, Зальцбург, Верхняя Аўстрыя (Фрайдэнталь), Ніжняя Аўстрыя, Вена, Чэхія і Маравія, Германія (Франконія, Верхняя Баварыя).

Пастаянная экспазіцыя складаецца з аб’яднаных у адзінай цэласнай сістэме экспанатаў і дызайна выставачных залаў. Звяртаючы ўвагу наведвальнікаў на біяграфічны кантэкст прадметаў калекцыі, супрацоўнікі знаёмяць гледачоў з артэфактамі этнічнай культуры: мэбля, вырабы для жытла, тэкстыль, кераміка, прылады працы, прадметы рэлігійнага культа і шмат іншае (пераважна XVII−XIX стст.). Дадзеныя рэчы рэпрэзентуюць паўсядзенны побыт людзей таго часу, знаёмяць наведвальнікаў з асяроддзем, у якім жыў і працаваў чалавек той эпохі. Асноўнымі сюжэтамі такіх выстаў з’яўляецца: чалавек і яго адносіны да прыроды і наваколля, сялянская эканоміка, калектыўная памяць, сацыяльны парадак. Выстаўкі музея прымаюць пераважна наведвальнікаў шырокага кола. Частай практыкай працы музея з наведвальнікамі з’яўляецца анкетаванне з мэтай паляпшэння якасці абслугоўвання, фарміравання меркавання наконт канцэпцыі выстаў і дызайну экспазіцыйна-выставачных залаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Этнаграфічны цэнтр (Вальядалід, Іспанія) Фонда Хоакіна Діаса з'яўляецца ўласнай установай культуры, асноўная мэта якой садзейнічаць павышэнню значнасі і трансляцыі культурнай спадчыны шляхам збережэння этнічнай традыцыі. Ён створаны ў 1985 годзе ў якасці хранілішча калекцый фалькларыста, музыказнаўцы Хаакіна Діаса. Аснову калекцыі складаюць музычныя інструменты, калекцыя грамафонаў, калекцыя мужчынскага і жаночага адзення правінцый Кастылья і Леон, калекцыя званоў. Акрамя таго, маецца фотаархіў і фанатэка, якая налічвае звыш 14 000 аўдыёзапісаў і 400 адзінак этнаграфічнага відыё, а таксама бібліятэка матэрыялаў і даследаванняў па музычным фальклоры, змешчаных у 16 000 тамах. Адной з сучасных форм працы з нематэрыяльнай культурнай спадчынай у Цэнтры з'яўляецца сайт Віртуальнага музея музычных інструментаў.

Музей Амерыкі (Мадрыд) захоўвае ў сваіх фондах зборы па археалогіі і этнаграфіі Амерыкі Нацыянальнага археалагічнага музея і Музея натуральных навук. Аснову калекцыі складаюць аб'екты з Каралеўскага кабінета натуральнай гісторыі (сярэдзіна XVIII ст.). Калекцыя налічвае звыш 25 000 адзінак захоўвання ад перадгісторыі амерыканскіх цывілізацый па цяперашні час.

Аснову працы музея, як і ў сусветнавядомым музеі Нідэрландаў – Rijksmuseum [7], складаюць навуковыя даследаванні. Менавіта яны з'яўляюцца папярэднім этапам аховы, рэпрэзентацыі і трансляцыі аб'ектаў культурнай спадчыны. Музей Амерыкі ў Мадрыдзе садзейнічае падтрыманню культурнай разнастайнасці і ў межах праектаў, звязаных з нематэрыяльнай культурай, гісторыі мастацтваў, музеязнаўства і змежных тэматычных калекцый праводзіць апрацоўку гістарыяграфіі для дальнейшага яе пераводу ў электронны фармат. Гэта работа ўключае ў сябе, у тым ліку, і распрацоўку інструментарыя для апісання і каталагізацыі. Музей займаецца таксама даследаваннямі па ахове і рэпрэзентацыі этнічнай культуры і забяспечвае падрыхтоўку навуковай літаратуры па тэме даследаванняў.

Этнаграфічны музей Кастыліі і Леона (Самора, Іспанія) быў створаны як дынамічны цэнтр па захаванні сусветнай культурнай спадчыны. Адна з мэт яго работы − цэнтралізаванае вывучэнне спадчыны і папулярызацыя навуковых дысцыплін, якія яе вывучаюць. З гэтай мэтай музею былі перададзена большая частка калекцыі Каха (Іспанія) – матэрыяльная спадчына (каля 10 000 адзінак), а таксама нематэрыяльная спадчына, − графічная і аўдыёвізуальная дакументацыя.

З пачатку заснавання музей стаў скарбніцай мудрасці і ведаў, накопленых пакаленнямі за ўсю гісторыю існавання Кастылы і Леона. Асноўная канцэпцыя дзейнасці музея – у сучасным грамадстве, у сучасных культурных, сацыяльных і эканамічных умовах − захаваць этнічную спадчыну. Блізкія падыходы да аховы НКС маюцца і ў Эстонскім музеі пад адкрытым небам (Эстонія). Музей складаецца з 72 пабудоў, якія ўвасабляюць аб'екты грамадскага прызначэння, аб'яднаныя тэматычнымі групамі. Такія комплексы знаёмяць наведвальнікаў не толькі з архітэктурай сялянскага жытла і побыту Эстоніі, але і з традыцыйным побытам людзей. Асаблівасцю рэпрэзентацыі НКС у Эстонскім музеі пад адкрытым небам з'яўляецца выкарыстанне аўтэнтычных формаў традыцыйнай культуры. У «дні жывой гісторыі» супрацоўнікі музея, апранутыя ў традыцыйныя строі, рэпрэзентуюць наведвальнікам традыцыйныя рамёствы і святы. У музеі рэгулярна ладзяцца семінары і заняткі па НКС [8].

Такім чынам, сама ідэя новай музеялогіі прайшла доўгі і складаны шлях. На працягу дзесяцігоддзя Ж. Рыўер распрацоўваў канцэпцыю экамузея, станаўленне тэорыі якога адбылося дзякуючы праведзенаму ў Квебеку ў 1984 г. Першаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міжнароднаму семінару «Экамузеі і новая музеялогія». Там была прынята «Квебекская дэкларацыя» [9], у якой утрымліваліся асноўныя палажэнні «Руху за новы тып музейнай установы», што вызначаўся адметнай сацыяльнай значнасцю. «У сучасным свеце, які імкнецца выкарыстоўваць для свайго развіцця ўсе сродкі, музеі павінны выйсці за межы традыцыйных задач і функцый: ідэнтыфікацыі, кансервацыі і асветы − і перайсці да здзяйснення больш шырокіх праграм, якія дазволяць ім актыўна ўдзельнічаць у жыцці грамадства і інтэгравацца ў акаляючае асяроддзе» − зазначана ў дэкларацыі [9, с. 21]. У дакуменце знайшлі адлюстраванне ідэі першых стваральнікаў і тэарэтыкаў экамузеяў.

У 1983 г. ў Монрэалі быў адзначаны Дзень экамузеяў. А ў 1985 г. ў Лісабоне на Другім міжнародным семінары была створана Міжнародная федэрацыя ў падтрымку новай музеялогіі. Акрамя таго, у гэты час заснаваны курсы «новай музеялогіі», створаны такія аб’яднанні, як «Новая музеялогія і сацыяльны эксперымент» у Францыі і Асацыяцыя экамузеяў Квебека.

У 1998 г. ў Турыне (Італія), на чарговай міжнароднай канферэнцыі, былі сфарміраваны ідэі стварэння нацыянальных і інтэрнацыянальных сетак экамузеяў. Планавалася, што будзе распрацавана сістэма па эфектыўнаму абмену інфармацыяй і супрацоўніцтва паміж экамузеямі розных краін. Накірунак музейнай работы, арганізацыйнае ўвасабленне якога пачалося ў 1983 г. у Лондане на Генеральнай канферэнцыі ІКОМа, а потым у 1984 г. ў Квебеку на Першым міжнародным семінары «Экамузеі і новая музеалогія», канчаткова быў сфарміраваны і прыняты музеязнаўчым светам толькі праз дзесяцігоддзе. Такім чынам, аналіз сведчыць, што ўстановы культуры свету адным з прыярытэтных накірункаў сваёй дзейнасці сталі лічыць захаванне і рэпрэзентацыю нематэрыяльнай культурнай спадчыны, што ўвасабляецца ў іх навукова-даследчай і практычнай працы: стварэнне нацыянальных і інтэрнацыянальных сетак экамузеяў, заснаванне курсаў «новай музеялогіі»; рэпрэзентацыя і трансляцыя аб’ектаў культурнай спадчыны ў экспазіцыях і выставах.


1. Скансен [Электронный ресурс] // Швеция. – Режим доступа : http://www.swedenland.com/stockholm/index.shtml?18. – Дата доступа : 19.08.2015.

2. Юренева, Т. Ю. Музееведение : учеб. для студентов гуманитар. специальностей вузов / Т. Ю. Юренева. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : Акад. проект, 2006. – 560 с.

3. Скараходаў, У. П. Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі / У. П. Скараходаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры, 2003. – 343 с.

4. Hazelius, A. Le Musée d'Ethnographie Scandinave à Stockholm / A Hazelius. – Stockholm : Norstedt & Soner, 1879. – 64 p.

5. Семененко, Т. Н. Экомузеи Франции: новые тенденции в развитии музейной идеологии / Т. Н. Семененко // Музейное дело : сб. науч. тр. / Музей Революции. – М., 1992. – Вып. 21 : Музей – культура – общество / сост.: М. Б. Гнедовский, О. Л. Климашевская. – С. 214–227.

6. Ривьер, Ж. А. Эволюционное определение экомузея / Ж. А. Ривьер // Museum. – 1985. – № 4. – С. 2–3.

7. Rijksmuseum [Electronic resource]. – Mode of access : https://www.rijksmuseum.nl. – Date of access : 29.08.2015.

8. Эстонский музей под открытым небом [Электронный ресурс] // Spb-Tallinn.ru. – Режим доступа : http://spb-tallinn.ru/museums/95.html. – Дата доступа : 18.08.2015.

9. Квебекская декларация: основные принципы новой музеологии : [принята в г. Квебеке, 13.10.1984 г.] // Museum. – 1985. – № 4. – С. 21.


РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ